ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 4 2004
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

# ГІСТОРЫЯ

УДК 947.6

С. Я. НОВІКАЎ

## АДЛЮСТРАВАННЕ Ў АЙЧЫННАЙ І ЗАМЕЖНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ГАСПАДАРЧАГА СТАНОВІШЧА АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 22.01.2002)*

Разгляд асобнага дырэктыўнага дакумента, выдадзенага роўна за тыдзень да ракавой даты 22 чэрвеня 1941 г. і вядомага як «Зялёная папка Герынга», абумоўлены на сённяшнім этапе развіцця айчыннай гістарыяграфіі рознымі прычынамі: *па-першае,* выяўленнем новых арыгінальных нямецкамоўных крыніц; *па-другое,* неабходнасцю іх крытычнага аналізу на ўзроўні сучасных ведаў; *па-трэцяе,* патрэбай у адэкватным адлюстраванні першакрыніцы ў навуковай літаратуры і інш. Прапануемы матэрыял, хаця і мае на мэце наблізіцца да вычэрпных адказаў у рамках акрэсленых праблем, між тым з'яўляецца толькі спробай аўтара намеціць шлях да іх канцэптуальнага вырашэння.

Спачатку звернем увагу чытача на назву, пад якой з'явіўся дакумент, захаваны ў замежных і айчынных архіўных фондах [1], адлюстраваны ў пасляваеннай гістарычнай літаратуры. Пачнём свой разгляд не з савецкіх, сучасных беларускіх ці расійскіх [2], а з нямецкамоўных выданняў [3], у якіх даследчыкі падаюць гістарычную назву толькі ў дзвюх формах: поўнай — *Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten* і скарочанай — *Gruene Mappe.* Заўважым, што менавіта гэтыя назвы сустракаюцца на ўсіх без выключэння вокладках і тытульных лістах арыгінальных выданняў (аўтару вядомы на сённяшні дзень 6 з іх як асобныя дакументальныя крыніцы. — *С. Н.*).

Спынімся на прыведзенай назве і паспрабуем даць ёй навуковае тлумачэнне, г. зн. будзем шукаць тое тэрміналагічнае азначэнне, без якога нельга адэкватна перадаць сэнс гістарычнага наймення ўсіх 6 выяўленых першакрыніц. Адзначым, што ісці па такім шляху нас прымушае даследчая практыка разгляду падзей, з'яў і фактаў з улікам іх этымалагічнай гісторыі ці гісторыі паходжання паняццяў, тэрмінаў, слоў і словазлучэнняў. Выкарыстаем для гэтага ўжо выпрабаваны гістарычна-лінгвістычны метад навуковага доследу [4]. Як вядома, ён патрабуе, з аднаго боку, вывучэння арыгінальнага нямецкамоўнага дакумента з улікам канкрэтнага гістарычнага кантэксту, з другога — звароту да лінгвістычнага разгляду прыведзенай назвы ў адпаведнасці з нормамі нямецкай мовы.

Паспрабуем правесці навуковы аналіз канкрэтных матэрыялаў, у першую чаргу тых, якія падмацаваны дакументальнымі крыніцамі і даюць дастаткова падстаў для вычэрпнага параўнання. На такім фоне неабходна адразу разгледзець гісторыю паходжання асобных тэрмінаў, а затым — цэлай назвы. Існуе сэнс звароту да гэтага і па той прычыне, што сучасны ўзровень вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны вызначаецца агульным станам распрацоўкі ўсёй праблематыкі ваеннай гісторыі і гісторыі вайны.

Пачнём з параўнання назвы ў дачыненні да тых яе азначэнняў, якія трывала замацаваліся ў савецкай, дагэтуль захоўваюцца ў сучаснай айчыннай, расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. У шматлікіх выданнях, калектыўных працах і манаграфіях дырэктыўныя матэрыялы пададзены пад самымі рознымі назвамі, у тым ліку: «Зеленая папка», «Так называемая «Зеленая папка» Геринга», «Указания по руководству экономикой» («Зелёная папка»), «Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных областях» («Зеленая папка»), «Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных областях (зеленая папка)», «Дырэктывы па кіраўніцтву эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях», «Ди-

рективы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных районах (зеленая папка)», «Директивы по руководству экономикой (Зеленая папка)», «Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных областях» («Зеленая папка» Геринга), «Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных областях» (зашифровано «Зеленая папка»), «Директивах по керівництву економікою в новоокупованих східних областях», «Дырэктывы па кіраўніцтву эканомікай акупіраваных усходніх абласцей» («Зялёная папка» Герынга) [5] і інш.

На першы погляд, такі пералік азначэнняў можна было б разглядаць як станоўчы вынік няспынных, паслядоўных і мэтанакіраваных пошукаў розных даследчых школ, асабліва калі ўявіць важнасць іх работы для метадалагічнай распрацоўкі ваеннай гісторыі, абгрунтавання розных канцэптуальных ці новых альтэрнатыўных падыходаў. У гэтым выпадку дэталёвае вытлумачэнне сутнасці самога дакумента, аналізу яго зместу і выяўленне яго асаблівасцей магло прывесці даследчыкаў да найбольш блізкіх і найменш бясспрэчных формул гістарычнай назвы, паколькі яна станавілася вынікам аб'ектыўнага навуковага разгляду наяўных дакументальных крыніц.

Аднак у савецкай гістарыяграфіі часта мела месца іншая практыка вывучэння дакументаў: не звяртацца да першакрыніц, а цалкам кіравацца на «аўтарытэтных» папярэднікаў ці на такія ж «манапалізаваныя» выданні. У асноўную крыніцу ведаў занадта часта пераўтваралі не навуковыя даследаванні, а ідэалагічную традыцыю. У выніку склалася сістэма ўяўленняў, якая і дыктавала асноўныя версіі назвы дырэктыўных дакументаў, іх вывучэнне метадам ігнаравання як асобных гістарычных крыніц, так і цэлых пластоў арыгінальных матэрыялаў. Пры гэтым ніхто практычна не падвяргаў сур'ёзнаму і крытычнаму тэксталагічнаму аналізу тыя «аўтарытэтныя» выданні, як ніхто і не падыходзіў да «манапалізаваных» ведаў з пазіцый гістарычна-лінгвістычнай навукі. Даследчыкі нібыта забываліся, што асноўная тэрміналогія гісторыі вайны і ваеннай гісторыі мае нямецкамоўнае паходжанне, таму яе разгляд трэба праводзіць, грунтуючыся, у першую чаргу, на этымалогіі арыгінальных нямецкіх назваў, тэрмінаў і словазлучэнняў.

Апошняе датычыцца разглядаемай намі «Зялёнай папкі», асабліва з улікам таго, што перад нямецкай ваеннай адміністрацыяй з першых дзён акупацыі ўсходніх тэрыторый пастаянна ўзнікалі новыя гаспадарчыя задачы, вырашэнне якіх патрабавала абнаўлення, перапрацоўкі і пастаяннага перавыдання матэрыялаў. У выніку змяненняў і дапаўненняў, унесеных нават за першыя паўгода, папка ўяўляла ўжо зусім іншы дакумент, які складаўся не з адной, а дзвюх самастойных частак: ч а с т к а I служыла галоўным арыенцірам для кіраўніцтва вайсковых частак і іх эканамічных службаў па арганізацыі гаспадарчай дзейнасці на новых занятых усходніх тэрыторыях і забеспячэнні арміі прадуктамі харчавання [6, bl. 7]; ч а с т к а II змяшчала дадатковы матэрыял да часткі I і з'яўлялася рабочым дакументам для гаспадарчых службаў, вайсковага кіраўніцтва і палітычнай адміністрацыі, утрымлівала важнейшыя ўказы, распараджэнні, дырэктывы, прадпісанні [7, s. 35] — г. зн. усё тое, што магло, на погляд вышэйшага ваеннага кіраўніцва Германіі, садзейнічаць выніковаму вядзенню гаспадаркі на Усходзе, у тым ліку і ў Беларусі.

Грунтоўнае вывучэнне гэтых дзвюх частак савецкая гістарычная навука доўгі час вяла ў рамках выдадзеных у 50—60-я гады збораў дакументальных матэрыялаў, якія толькі напрыканцы XX ст. патрапілі ў поле сур'ёзнай навуковай экспертызы. Напрыклад, у апошнія гады ў Маскве пабачылі свет грунтоўныя гістарычныя працы, сярод якіх з'явіліся і такія, дзе спецыялісты-гісторыкі не пакінулі незаўважанай і назву разглядаемых намі дырэктыўных матэрыялаў. Важна адзначыць, што расійскія калегі паспрабавалі па-новаму высвятліць асобныя бакі назвы «Зялёная папка», адысці ад традыцыйных азначэнняў гістарычнага дакумента і надаць яму некалькі новае гучанне: у першым выпадку гэта — «Зеленая папка» *для Советского Союза*» [8, с. 373] (тут і далей выдзелена мной. — *С. Н.*), у другім — «Директивы по руководству экономикой в новых *захваченных* восточных *районах* (Зеленая папка)» [9, с. 118].

Зразумела, што праца над гістарычнымі паняццямі не з'яўляецца простай справай. Выяўленне ступені ідэнтычнасці навуковых тэрмінаў, паняццяў і іх гістарычных азначэнняў — той напрамак, які будзе мець свой працяг толькі пры ўмове зацвярджэння сярод навукоўцаў і шырокай грамадскасці думкі аб неабходнасці пераасэнсавання гісторыі вайны і ваеннай гісторыі на аснове выключна арыгінальных крыніц ці дакументальных матэрыялаў. Хаця даследчыкі пры гэтым стаяць перад цяжка вырашальнай дылемай: ці прытрымлівацца ўжо выпрацаванага погляду ў падыходах, ацэнках і меркаваннях, ці дапускаць магчымасць адначасо-

вага існавання розных навуковых ідэй, думак і канцэпцый, у тым ліку альтэрнатыўных. Праблема заключаецца ў тым, што ў айчыннай гістарыяграфіі дагэтуль адсутнічаюць агульнапрынятыя крытэрыі вызначэння гістарычнай ісціны ў дачыненні да назваў іншамоўнага паходжання, паколькі доўгі час панаваў самы выніковы спосаб выбару — ідэалагічнай ці інстытуцыйнай мэтазгоднасці. Але сёння ён не вытрымлівае нават крытыкі, не кажучы пра сур'ёзную навуковую экспертызу.

Узнікае заканамернае пытанне — чым кіравацца пры распрацоўцы паняційнага апарату падчас правядзення падобных даследаванняў? Здавалася, што самы просты шлях — прытрымлівацца раней уведзенай і найбольш распаўсюджанай назвы дырэктыўных матэрыялаў, не звяртаючы ўвагі на сутнасць замацаванага азначэння. Між тым якраз пры такім падыходзе гісторыкі часцей за ўсё трапляюць у залежнасць ад фармальных, а не аб'ектыўных фактараў. На нашу думку, этапы гістарычнага шляху самой назвы могуць вызначацца і мець рацыю толькі ў тым выпадку, калі даследчыкі будуць здольны весці свой пошук у рамках навукова і канцэптуальна распрацаваных высноў.

Сёння на гэтым даследчым полі праяўляюцца дзве тэндэнцыі, два падыходы да вывучэння іншамоўных дакументальных крыніц і матэрыялаў. У адпаведнасці з першым — захоўваюцца традыцыйныя назвы гістарычнага дакумента, у другім выпадку вядзецца самастойны дослед. Аўтар гэтага матэрыялу з'яўляецца прыхільнікам крытычнага аналізу дакументальных крыніц. Таму сучасная назва дырэктыўных матэрыялаў з'яўляецца, па нашым перакананні, вынікам як агульнай распрацоўкі пытання, так і выкарыстання альтэрнатыўных падыходаў. Грунтуючыся на гэтым, на суд спецыялістаў-гісторыкаў, навукоўцаў і шырокай грамадскасці выносіцца назва — **«Дырэктывы па *вядзенні гаспадаркі*** (тут і далей выдзелена аўтарам. — *С. Н.*) **на *новазанятых* усходніх *тэрыторыях* (Зялёная папка)».**

Адразу патлумачым сутнасць такой назвы дырэктыўнага дакумента.

*Па-першае,* паспрабуем уявіць сабе сэнс словазлучэння *«вядзенне гаспадаркі»*. Аўтар падзяляе яго на дзве часткі і вызначае ў якасці зыходнага якраз другі тэрмін — г а с п а д а р к у. Пад ёй мы разумеем не ўсю сукупнасць вытворчых адносін, якія практычна адсутнічалі ва ўмовах панавання акупацыйнага рэжыму на захопленай тэрыторыі, а толькі асобныя кірункі ці бакі дзейнасці нямецкай ваеннай і цывільнай адміністрацыі ў Беларусі ў гады акупацыі. У той час як тэрмін э к а н о м і к а азначае якраз сукупнасць ці сістэму усіх вытворчых адносін, іх канкрэтную арганізацыю, выкарыстанне адпаведных адміністрацыйных структур і іх агульнай гаспадарчай дзейнасці па развіцці прадукцыйных сіл усяго (!) грамадства. Гэта азначае, што такая сістэма адносін першапачаткова якраз і не была закладзена ў аснову першага выдання «Зялёнай папкі» [10].

*Па-другое,* згадаем тэзу з арыгінальнага дакумента аб выключным значэнні новазанятых тэрыторый для «далейшага *вядзення* (выдзелена мной. — *С. Н.*) вайны» [11, bl. 1]. У адпаведнасці з дырэктывамі тэрыторыя Беларусі адразу ж трапляла ў сферу дзейнасці ўпаўнаважанага па чатырохгадовым плане — рэйхсмаршала Г. Герынга, які адначасова з'яўляўся ўпаўнаважаным як па *кіраванні* эканомікай Трэцяга Рэйху, так і па *вядзенні* гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях. Такія планы фарміраваліся на аснове новых уяўленняў аб ваенна-эканамічных задачах і характары дзейнасці будучых выканаўцаў гэтых стратэгічных праграм, удакладненых у сакавіку 1941 г. з улікам выключнай ролі эканамічных інтарэсаў усіх суб'ектаў акупацыйнага рэжыму на новай «жыццёвай прасторы на Усходзе».

*Па-трэцяе,* абгрунтуем неабходнасць увядзення словазлучэння *«новазанятыя тэрыторыі»*, якое вынікае з шэрагу загадаў, указаў і распараджэнняў, зацверджаных вышэйшым кіраўніцтвам Трэцяга Рэйху ў першыя тыдні ваеннай аперацыі на Усходзе [12]. Размова пра гістарычныя і лінгвістычныя падставы для ўвядзення такога азначэння ішла ў апошні час у беларускім друку на прыкладзе рэйхсміністэрства па занятых усходніх тэрыторыях. Апрача таго, мы канстатуем, што застаецца ў сіле і ўмоўнае абазначэнне, да якога прыйшлі ў эканамічным штабе «Ольдэнбург» [13, bl. 6] падчас распрацоўкі дырэктыў (паколькі матэрыялы былі аздоблены знешне зялёнай вокладкай і таму натуральна, што за імі адразу замацавалася назва «Зялёная папка»).

Разгляд прыведзеных вышэй словазлучэнняў, асобных паняццяў і азначэнняў дае ў рэшце рэшт падставу для выяўлення сярод іх і ключавой назвы. На нашу думку, ёй з'яўляецца назва «Зеленая папка Геринга», якая была адначасова і загалоўкам невялікай брашуры, выдадзенай галоўным палітычным выдавецтвам у 1942 г. пад аўтарствам А. Лявонцьева [14]. Менавіта ён быў першым, хто паспрабаваў у складанейшых умовах ваеннага часу навукова апрацаваць матэрыялы, захопленыя Чырвонай Арміяй у якасці трафеяў пры разгроме аднаго з нямецкіх

вайсковых штабоў. Знаёмства з часткай I «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі» прывяло даследчыка да думкі, якую А. Лявонцьеў выказвае ў сваёй кароценькай прадмове да працы. Аўтар зазначае, што «ни один будущий историк Великой отечественной (так у тэксце. — *С. Н.*) войны... не сможет пройти мимо этого документа» [14, с. 3], аднак не тлумачыў чаму, не згадваў тых аргументаў, якія прывялі яго да такіх перакананняў (інакш такую тэзу можна разглядаць не больш як факт прапагандысцкай работы).

Між тым, каштоўнасць працы А. Лявонцьева цяжка пераацаніць: у ёй амаль адсутнічаюць спасылкі на «аўтарытэтныя» выданні, а рэальнасць першага года акупацыі апісана з усёй магчымай дакладнасцю. Таму да яго поглядаў трэба паставіцца з асаблівай увагай. Такі падыход прадыктаваны і рамкамі нашага даследчага дыскурсу па выяўленні сутнасці якраз назвы працы. Паспрабуем асэнсаваць яе з улікам поглядаў А. Лявонцьева і будзем пры гэтым кіравацца тым, што згаданае азначэнне: *па-першае,* змяшчае адметнае словазлучэнне, у якім назва самога дакумента адступае на задні план у выніку ўвядзення імя рэйхсмаршала Герынга; *па-другое,* адлюстроўвае арыгінальны аўтарскі погляд, на сутнасць якога асобны, калі не вырашальны, адбітак накладвала рэчаіснасць ваеннага часу; *па-трэцяе,* заключае ў сабе адказ на прынцыпова важнае пытанне аб сутнасці акупацыйнага рэжыму на новазанятых усходніх тэрыторыях.

Асэнсаванне самой назвы патрабуе звароту да першапачатковай гіпотэзы працы А. Лявонцьева, паколькі ён на старонках выдання выкарыстоўвае выключна вынесенае ў загаловак азначэнне — «Зеленая папка Геринга» (усяго па тэксту на 42 старонках (з іх 6 з'яўляюцца копіямі арыгінальнага дакумента) гэта назва сустракаецца 42 разы з улікам загалоўка і астатніх згадак). Прасочым, наколькі яна адпавядала дырэктыўным матэрыялам, з'яўлялася ідэнтычнай назвай, вытрымала навуковую праверку на сапраўднасць гістарычнай практыкі, аднак звернемся для гэтага да пасляваеннай беларускай гістарыяграфіі: у якой ступені ў ёй была вывучана назва, як да апошняй ставіліся айчынныя даследчыкі, з чым не пагаджаліся і г. д.? Толькі праз чвэрць стагоддзя пасля выхаду ў свет навуковая першакрыніца дайшла да беларускага чытача дзякуючы аднаму з юбілейных акадэмічных выданняў, прысвечанаму гісторыі эканамічнага развіцця савецкай Беларусі [15, с. 285—318]. «Зялёная папка» трапляе на старонкі гэтай манаграфічнай працы, дзе разглядаецца ў кантэксце праблемы «Экономика Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941—1945 гг.)». Тут яна набывае новыя азначэнні, сярод якіх — «Памятка», «программа» экономического порабощения», «Директивы по руководству экономикой во вновь оккупированных восточных областях» (зашифровано «Зеленая папка») [15, с. 292].

Адметна, што сярод матэрыялаў, выкарыстаных аўтарамі пры падрыхтоўцы раздзела, сустракаецца і брашура А. Лявонцьева. Праз 25 гадоў яна ўпершыню прыводзіцца ў акадэмічным выданні, на яе спасылаюцца, аднак пры гэтым аўтары адыходзяць ад канцэпцыі А. Лявонцьева: замест назвы «Зеленая папка Геринга» (так у першакрыніцы. — *С. Н.*) згадана «Зеленая папка» Геринга». Падтрымліваючы па азначэнні апошнюю назву, аўтар гэтых радкоў, тым не менш, схіляецца да думкі аб неабходнасці захавання канцэпцыі А. Лявонцьева. Па нашым меркаванні, ён у сваёй брашуры, як адзначалася вышэй, зрабіў акцэнт на імя рэйхсмаршала па той прычыне, што менавіта праз яго хоча падкрэсліць перавагу Герынга ў адносінах да іншых кіраўнікоў ваеннай і цывільнай адміністрацыі ў сувязі з наданнем у кантэксце ажыццяўлення «доўгатэрміновай праграмы каланізацыі Усходу» асаблівага значэння не толькі ваенна-палітычным, але і ваенна-эканамічным мэтам. Менавіта на гэтым фоне, прычым з улікам добра вядомых яму канкрэтных умоў акупацыі, А. Лявонцьеў засяроджвае ўвагу на эканамічнай палітыцы нямецкага акупацыйнага рэжыму. Аднак беларускія даследчыкі 1960-х вырашаюць інакш лёс навуковай крыніцы з яе першапачатковай назвай, надаючы апошняй форму «Зялёная папка» Герынга» [16].

Цікавы лёс напаткаў гэтыя дырэктыўныя матэрыялы не толькі ў савецкай, але і сучаснай айчыннай гістарычнай літаратуры, у выніку чаго для большасці чытацкай аўдыторыі нават на сённяшні дзень з'яўляюцца малавядомымі два зборы ці дзве часткі дырэктыўных матэрыялаў пад агульнай назвай «Зялёная папка»: яна пакуль застаецца неапублікаванай у поўным аб'ёме; адсутнічае археаграфічная апрацоўка гэтай дакументальнай крыніцы; не праведзена яе спецыяльнае навуковае вывучэнне; не выяўлены гістарычныя сувязі паміж гэтым і іншымі зборамі арыгінальных нямецкамоўных матэрыялаў і г. д. Гэта цяжка зразумець, асабліва калі мець на ўвазе тое, што кожнай з прыведзеных папак надавалася асобнае значэнне ў рамках ажыццяўлення нацысцкай Германіяй сваёй эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Разгляд сутнасці гэтага пытання патрабуе звароту да новых крыніц, сярод якіх — яшчэ адна папка з дырэктыўнымі матэрыяламі — малавядомая айчынным даследчыкам «Карычневая папка» [17]. Праўда, зусім кароткія звесткі пра яе можна знайсці ў некаторых савецкіх выданнях. Аднак пасля вывучэння гэтых матэрыялаў узнікае шмат пытанняў. Пошук адказаў непасрэдна ў разгледжаных працах прыводзіць нас да таго, што ў іх нам удаецца адшукаць толькі некалькі радкоў аб гэтым дакуменце, дакладна: «основные распоряжения и указы имперского министра оккупированных восточных областей по руководству восточными областями с гражданским управлением входили в «Зеленую папку» и имели название «Коричневая папка» [18, с. 48]. Як разумець два апошнія сцвярджэнні, калі гэтыя папкі не з'яўляюцца адным і тым жа дакументам, а ўключэнне невялікай вытрымкі з апошняй было прадыктавана, на наш погляд, тым, што прыведзены матэрыял пацвярджаў і замацоўваў факт наяўнасці канкрэтных ваенных і цывільных (палітычных) службаў, кожная з якіх выконвала блізкія, але свае задачы? Да ўсяго, іх непасрэднымі выканаўцамі з'яўляліся самастойныя суб'екты нямецкага акупацыйнага рэжыму ў Беларусі, як гэта вынікае з арыгінальнага дакумента, матэрыялы якога практычна адсутнічаюць у айчынных даследчыкаў па прычыне таго, што не былі цалкам надрукаваны ні ў адным з савецкіх выданняў? Больш таго, вельмі цяжка меркаваць аб самой «Карычневай папцы» толькі праз тую частку, якая ў 1960-я гады была надрукавана як «основные распоряжения и указы» Розенберга [19]. Але ж першапачаткова яна па сваім аб'ёме практычна нічым не ўступала «Зялёнай папцы».

Звернемся да нямецкамоўнага арыгінала «Карычневай папкі» [20], якая мае загаловак — *Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe). Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung.* Перш чым спынімся на яе назве, адзначым, што калі «Зялёная папка» з'яўлялася дырэктыўным матэрыялам, якім кіравалася ваенная адміністрацыя на ўсёй тэрыторыі Беларусі, то частка I «Карычневай папкі» разглядалася ў якасці кіруючых указанняў для цывільнай адміністрацыі на тэрыторыі рэйхскамісарыята Остланда, у тым ліку з генеральнай акругай Беларусь, а частка II — дзесяці «беларускіх» акруг рэйсхкамісарыята Украіна [20, s. 5]. Інтарэс да «Карычневай папкі» ў гэтай сувязі можа быць выкліканы не толькі адміністрацыйнай, але і гістарычнай прывязкай, сутнасць якой неабходна шукаць якраз у назвах гэтых папак.

Звернемся да назвы апошняй з іх і паспрабуем паглядзець менавіта праз поўнае найменне дакумента на тыя гістарычныя моманты, якія ўзнікалі перад цывільнай адміністрацыяй як аднаго з «слупоў» [21, s. 130] акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Остланда і Беларусі. Сэнсавае азначэнне гэтай назвы набліжае нас да адказаў на асобныя пытанні, якія разглядаліся вышэй у дачыненні да тэрміна «Зялёная папка». Па нашым перакананні, новыя дырэктыўныя матэрыялы невыпадкова мелі назву — *«Цывільнае кіраванне на занятых усходніх тэрыторыях (Карычневая папка). Частка А: Дырэктывы па вядзенні гаспадаркі»* (пераклад аўтара. — *С. Н.*).

Як бачна, практычна кожнае слова назвы мае сваё гістарычнае азначэнне, асэнсаваць, наблізіцца да якога нам пажадана ў кантэксце агульнага даследу. Таму звернем увагу чытача толькі на два ключавыя, на наш погляд, тэрміны, якія вынікаюць з першага і апошняга нямецкіх складаных слоў у назве дакумента: адпаведна — *цывільнае кіраванне* і *вядзенне гаспадаркі.* Калі першы тэрмін практычна не дае падстаў для варыятыўнага разгляду сутнасці той дзейнасці, якая вынікала непасрэдна з самога словазлучэння для цывільнай адміністрацыі, дык гэтага нельга сказаць пра другі тэрмін. Калі разгледзець яго ў рамках традыцыйнага падыходу, а г. зн. ужываць з азначэннем «кіраванне эканомікай», тады атрымліваецца, што цывільнай адміністрацыі, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі (адпаведна — генеральныя камісарыяты Беларусі, Валыніі-Падоліі і Жытоміра), трэба было забяспечваць толькі кіраванне сваімі структурамі без уліку самага галоўнага для перыяду вайны — выканання на месцах усіх дырэктыў, указаў, загадаў, распараджэнняў і г. д. Аднак гістарычная рэчаіснасць сведчыць аб адваротным [22, s. 4—97], што ў значнай ступені схіляе нас да ўвядзення якраз другога тэрміна — вядзенне гаспадаркі.

Такім чынам, выкарыстанне крытычнага аналізу для вывучэння этымалогіі вышэйзгаданай арыгінальнай і навуковай назвы прыводзіць аўтара да наступных высноў: 1) дырэктывы па вядзенні гаспадаркі ці «Зялёная папка» з'яўляюцца арыгінальнай першакрыніцай па гісторыі вайны і ваеннай гісторыі Беларусі, таму не могуць заставацца без уліку пры даследаванні гістарычнай праблематыкі Вялікай Айчыннай вайны; 2) матэрыялы арыгінальнага дакумента складаюць неад'емную частку не толькі крыніцазнаўчай базы асобных навуковых прац, але і ўсёй сучаснай айчыннай гістарыяграфіі; 3) вывучэнне ваеннай праблематыкі сёння патрабуе значнай актывізацыі археаграфічнай працы па выяўленні нетрадыцыйных (іншамоўных) да-

кументальных крыніц; 4) тэксталагічная апрацоўка матэрыялаў у бліжэйшым будучым магчыма пры вылучэнні спецыяльнай канцэпцыі па даследаванні праблем гісторыі другой сусветнай вайны; 5) правядзенне навукоўцамі, архівазнаўцамі, даследчыкамі работы па выпраўленні памылак у перакладных нямецкамоўных паняццях, тэрмінах, словазлучэннях і адпаведнай карэкцыі існуючых назваў афіцыйных загадаў, указаў, распараджэнняў і г. д. — адна з важных задач сучаснай гістарычнай навукі.

Сказанае вышэй азначае: сённяшні дзень айчыннай навукі патрабуе ад даследчыкаў рашучага выкарыстання новых навуковых падыходаў, без якіх цяжка расшыць самыя вузкія месцы і адэкватна асвятліць праблему нацысцкай эканамічнай палітыкі ў акупаванай Беларусі (1941—1944 гг.).

## Літаратура


1. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей ВА-МА). RW 31/128: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft. 1. Auflage; Hrsg. vom Wirtschaftsfuehrungsstab Ost. Berlin, Juni 1941 (mit 1. Anlage); RW 31/128: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft. 2. Auflage. Berlin, Juli 1941 (mit 2. Anlage); RW 31/130: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil II: Ergaenzungsmaterial zu Teil I. Berlin, November 1941; RW 31/131: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil II (2. Auflage): Ergaenzungsmaterial zu Teil I. Berlin, August 1942; RW 31/132: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil II (3. Aufalge): Ergaenzungsmaterial zu Teil I. Berlin, September 1942; RW 31/133: Ergaenzungen und Berichtigungen zu den 3. Auflage des Teils II der Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe) vom November 1942 — Februar 1943 // Wi Stab Ost, Stab Abt. III, Nr. 65753/ 43 geh.; Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НА РБ), ф. 370, воп. 6, спр. 1, л. 1—30 // OKW: Wi Fue Stab Ost, Stab/ Wi Rue Amt, Stab Ia, 119/41: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft (Fall «Barbarossa»).

2. Беларуская Савецкая энцыклапедыя: У 12 т. Т. 1. Мн., 1969. С. 210; Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 4. Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938—1945 гг.). Мн., 1975. С. 177; Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: В 3 т. Т. 1. Мн., 1983. С. 186; Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995. С. 3; Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941—1944): Документы и материалы: В 2 кн. Кн. 1. Мн., 1996. С. 263; Кн. 2. Мн., 1997. С. 395; Великая Отечественная война. 1941—1945. Военно-исторические очерки: В 4 кн. Кн. 4. Народ и война. М., 1999. С. 119; Война и политика, 1939—1941. М., 1999. С. 352; Семиряга М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы второй мировой войны. М., 2000. С. 80, 373; Коваленя А. А. Беларусь 1939—1945 гг.: Война и политика. Мн., 2001. С. 104.

3. Braeutigam O. Ueberblich ueber die besetzten Ostgebiete waehrend des 2. Weltkrieges. Tuebingen, 1954. S. 4; Wilenchik W. Die Partisanenbewegung in Weissrussland 1941—1944 // Forschungen zur osteuropaeischen Geschichte. Bd. 34. Berlin, 1984. S. 194; Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4. Der Angriff auf die Sowjetunion. 2. Auflage. Stuttgart, 1987. S. 147; Lenhard H. «Lebensraum im Osten». Deutsche in Belorussland 1941—1944. Duesseldorf, 1991. S. 249; Europa unterm Hackenkreuz. Die Okkupationspolitik des deutschen Faschismus (1939—1945). Achtbaendige Dokumentenedition. Bd. 5: Die faschistische Okkupationspolitik in den zeitweilig besetzten Gebieten der Sowjetunion (1941—1944). Berlin, 1991. S. 172; Mueller R.-D. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943: der Abschlussbericht des Wirtschaftstabes Ost und Aufzeichnungen eines Angehoerigen des Wirtschaftskommandos Kiew. Boppard a. R., 1991. S. 35; Aly G. A., Heim S. Vordenker der Vernichtung: Auschwitz und die deutschen Plane fuer eine neue europaeische Ordnung. Frankfurt a. M., 1997. S. 372; Nationalsozialistische Vernichtungspolitik 1939—1945. Neue Forschungen und Kontroversen. Frankfurt a. M., 1998. S. 270; Gerlach Ch. Kalkulierte Morde: die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944. Hamburg, 2000. S. 144, 239 u. a.

4. Новікаў С. Я. Падмурак навуковых гістарычных ведаў — гістарычныя крыніцы: знаёмства з новым архіўным дакументам // Вести Института современных знаний. 1999. № 1. С. 58—58; Новиков С. Е. Через новые документальные источники — к малоизвестным страницам истории войны // Історія слов'янскіх народів: Актуальні проблеми дослідження. Вип. 6: Слов'янскі народи в другій світовій війні. Кіеў, 2000. С. 13—18; Новікаў С. Я. Крытычны аналіз як сродак навуковага даследу архіўных матэрыялаў па гісторыі другой сусветнай вайны // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 1. Мн., 2000. С. 152—159; Новікаў С. Я. «Першы ўказ фюрэра...» як падстава для пытанняў і адказаў (знаёмства з невядомым архіўным дакументам) // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 3. С. 58—61.

5. Нюрнбергский процесс. Сб. материалов. Т. 1. М., 1954. С. 715; Нюрнбергский процесс над главными военными преступниками. Сб. материалов: В 7 т. Т. 3. М., 1958. С. 496; Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сб. материалов: В 3 т. Т. 1. М., 1965. С. 152, 153; Т. 2. М., 1966. С. 181; «Совершенно секретно! Только для командования!»: Стратегия фашистской Германии в войне против СССР. Документы и материалы. М., 1967. С. 100; Українська РСР у Великій Вітчизняній війні Радянського Союзу 1941—1945 рр. В 3 т. Т. 1. Київ, 1967. С. 368; Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944). М., 1968. С. 35, 39, 56; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967. Мн., 1968. С. 292; Украинская ССР в Великой Отечественной войне Советского Союза 1941—1945 гг: В 3 т. Т. 1. Киев, 1975. С. 357; Факторович А. А. Крах аграрной политики немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Мн., 1979. С. 15; Загорулько М. М., Юденков А. Ф. Крах плана «Ольденбург»: О срыве экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР. М., 1980. С. 48; Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков: В 3 т. Т. 1.

Мн., 1983. С. 186; Нюрнбергский процесс: Сб. материалов: В 8 т. Т. 4. М., 1990. С. 365; Военно-исторический журнал. 1991. № 4. С. 9; К о в а л е н я А. А. Беларусь 1939—1945 гг.: Война и политика. Мн., 2001. С. 104.

6. BA-MA. RW 31/80: OKW/ Wi Z I/II. Aus Akte «Oldenburg».

7. M u e l l e r R.-D. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941—1943: der Abschlussbericht des Wirtschaftstabes Ost und Aufzeichnungen eines Angehoerigen des Wirtschaftskommandos Kiew. Boppard a. R., 1991.

8. С е м и р я г а М. И. Коллаборационизм. Природа, типология и проявления в годы второй мировой войны. М., 2000.

9. Военно-исторические очерки: В 4 кн. Кн. 4. Народ и война. М., 1999.

10. BA-MA. RW 31/128: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Gruene Mappe), Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft. 1. Auflage. Berlin, Juni 1941 (mit 1. Anlage).

11. НА РБ, ф. 370, воп. 6, спр. 1 // OKW: Wi Fue Stab Ost, Stab/ Wi Rue Amt, Stab Ia, 119/ 41: Richtlinien fuer die Fuehrung der Wirtschaft (Fall «Barbarossa»).

12. Erlass des Fuehrers ueber die Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten vom 29.06.41 // BA-MA. RW 31/132. Bl. 9; Erlass des Fuehrers ueber die Verwaltung der neubesetzten Ostgebiete vom 17.7.41 // BA-MA. RW 31/132. Bl. 10; Erlass des Fuehrers ueber die polizeiliche Sicherung in den neubesetzten Ostgebiete vom 17.7.41 // BA-MA. RW 31/132. Bl. 12; Erster Erlass des Fuehrers ueber die Einfuehrung der Zivilverwaltung in den neubesetzten Ostgebieten vom 17.7.41 // BA-MA. RW 31/132. Bl. 13 u. a.; Приказ Гитлера о гражданском управлении во вновь оккупированных восточных областях. 17 июля 1941 г.; Указ Гитлера о полицейской охране оккупированных восточных областей. 17 июля 1941 г. // Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944). М., 1968. С. 51—55.

13. BA-MA. RW 31/80.

14. Л е о н т ь е в А. «Зеленая папка Геринга». ОГИЗ — Госполитиздат, 1942.

15. Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967. Мн., 1968.

16. Р а м а н о ў с к і В. П., Х а ў р а т о в і ч І. П. Акупацыйны рэжым // Беларуская Савецкая энцыклапедыя: У 12 т. Т. 1. Мн., 1969. С. 210; Р а м а н о ў с к і В. П. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму // Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 4. Мн., 1975. С. 177.

17. BA-MA. RW 31/ 134. Der Reichsminister fuer die besetzten Ostgebiete, III Wi 2461/ 42. Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe), Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung. Berlin, April 1942; НА РБ, ф. 652, воп. 1, спр. 2, л. 1—77: Der Reichsminister fuer die besetzten Ostgebiete, III Wi 2461/ 42. Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe), Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung. Berlin, April 1942.

18. З а г о р у л ь к о М. М., Ю д е н к о в А. Ф. Крах плана «Ольденбург»: О срыве экономических планов фашистской Германии на временно оккупированной территории СССР. М., 1980.

19. Нюрнбергский процесс над главными немецкими военными преступниками: Сб. материалов: В 3 т. Т. 2. М., 1966.

20. BA-MA. RW 31/ 134. Die Zivilverwaltung in den besetzten Ostgebieten (Braune Mappe), Teil A: Richtlinien fuer die Wirtschaftsfuehrung. Berlin, April 1942.

21. Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. Bd. 4. Der Angriff auf die Sowjetunion. Stuttgart, 1987.

22. B r a e u t i g a m O. Ueberblich ueber die besetzten Ostgebiete waehrend des 2. Weltkrieges. Tuebingen, 1954.

*S. Ya. NOVICKAW*

**ECONOMIC SITUATION IN NAZI-OCCUPIED BELARUS AS REFLECTED BY LOCAL AND FOREIGN HISTORIANS**

## Summary

The main approaches of Belarussian and German historians to some problems of economic policy of Nazi Germany on the territory of occupied Belarus (1941—1944) are examined.